CENTRALNA
KOMISJA
EGZAMINACYJNA

Arkusz zawiera informacje prawnie chronione do momentu rozpoczęcia egzaminu.

MOB
2015

UZUPEŁNIA ZDAJĄCY

KOD

PESEL

| | | |
|---|---|---|
| | | |

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | |

*miejsce na naklejkę*

☐ dysleksja

# EGZAMIN MATURALNY Z JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO

## POZIOM PODSTAWOWY

DATA: **22 maja 2015 r.**

GODZINA ROZPOCZĘCIA: **9:00**

CZAS PRACY: **170 minut**

LICZBA PUNKTÓW DO UZYSKANIA: **50**

**Instrukcja dla zdającego**

1. Sprawdź, czy arkusz egzaminacyjny zawiera 11 stron. Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
3. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
4. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie będą oceniane.
5. Możesz korzystać ze słowników językowych.
6. Na tej stronie oraz na karcie odpowiedzi wpisz swój numer PESEL i przyklej naklejkę z kodem.
7. Nie wpisuj żadnych znaków w części przeznaczonej dla egzaminatora.

MOB-P1_**1**P-152

☐

MOB
2015

Układ graficzny
© CKE 2015

**Заданне 1.**

Юліта Стэпанюк

***Бардаўская Восень!***

Сонца схавалася за хмарамі, туман, дождж, пажоўклае лісце – гэта знак, што восень уладарыць напоўніцу і час на Фестываль „Бардаўская Восень"! […] Арганізатарам Фестывалю, які 19-ты раз гасціць на Падляшшы, з'яўляецца Звяз Беларускай Моладзі. „Бардаўская Восень" – гэта адзін з тых фестываляў, дзе ад самага пачатку можна было паслухаць больш смелай творчасці. Праз 19 гадоў нічога не змянілася, а „Барды" надалей збіраюць выключных творцаў і ўражлівую публіку.

Падчас 5 фестывальных дзён […] аматары бардаўскай песні змогуць прыняць удзел у канцэртах, на якіх выступяць як вядомыя і любімыя беларускія творцы, гэтак і маладыя, што толькі робяць першыя крокі на „бардаўскай" сцэне. Побач з „ветэранамі" Фестывалю […] выступяць дэбютанты. […]

Некалькі гадоў „Бардаўская Восень" гасцюе ў сталіцы Падляшша – Беластоку. Сёлета ў новым гмаху Падляшскай Оперы і Філармоніі прадставіць сябе пераможца Grand Prix ды госці фестывалю: Bosae Sonca (са спецыяльна падрыхтаванай акустычнай праграмай), гурт-гаспадар ILO & friends ды вядомы беларускі музыка Зміцер Вайцюшкевіч пад акампанемент слыннага W-Z Orkiestra. […]

Фестываль „Бардаўская Восень" – гэта найстарэйшы такога кшталту фестываль беларускай бардаўскай ды аўтарскай песні. Класічныя барды, стваральнікі аўтарскіх песень ды акустычныя праграмы рок-гуртоў. „Бардаўская Восень" – гэта фестываль, які стараецца адлюстроўваць актуальны стан беларускай аўтарскай песні ў многіх плашчынах, спалучаючы ў сабе розныя стылі і накірункі. З 1994 г. на „бардаўскай" сцэне прадстаўленыя найлепшыя выканаўцы, што прэзентуюць гэты гатунак музыкі.

www.vosien.org

**Заданне 1.1. (0–1)**

Адшукай эквіваленты да дэфініцый.

А. Той, хто ўпершыню выступае на якім-небудзь полі дзейнасці – ..................................

Б. У гэтым годзе – ..........................................................................................................

**Заданне 1.2. (0–1)**

Утвары назоўнікі ад дадзеных дзеясловаў.

А. адлюстроўваць – ..........................................................................................................

Б. прэзентаваць – ............................................................................................................

**Заданне 1.3. (0–1)**

Напішы лічэбнікі словамі.

А. праз 19 гадоў – праз ……………………………………………………...………. гадоў

Б. падчас 5 фестывальных дзён – падчас …...…………...…………… фестывальных дзён

**Заданне 1.4. (0–1)**

Падбяры сінонімы да дадзеных слоў:

А. туман – ..............................................................................................................

Б. выключны – .........................................................................................................

**Заданне 1.5. (0–1)**

Галоўная мэта тэксту – гэта

А. інфармацыя.

Б. ацэнка фестывалю.

В. заахвочванне да ўдзелу ў мерапрыемстве.

**Заданне 2.**

Юрка Асеннік
Павал Станкевіч

***БАСовішча – фестываль беларусаў у Польшчы***

БАСовішча – фестываль беларусаў у Польшчы – праходзіць у Кнышынскай пушчы, каля беларуска-польскай мяжы. Арганізаваны з 1990 года дзеля інтэграцыі беларускага асяроддзя. Прэзентуе музычныя здабыткі народу па абодва бакі дзяржаўнай мяжы. […] На лясной паляне праходзіць адзін з найбольш арыгінальных рок-фестываляў у гэтай частцы Еўропы.

Ясна, мы – польскія беларусы – тут гаспадары. І БАСовішча – гэта для нас месца супольнай сустрэчы з беларускай музыкай. Хочам дзерці глотку пад сцэнай і спяваць песні на блізкай нашаму сэрцу беларускай мове. Мы – нацыянальная меншасць, але таксама частка большай супольнасці. У нас польская дзяржаўнасць, беларуская нацыянальнасць і еўрапейская культура. Жывем у месцы, дзе на працягу стагоддзяў спатыкаліся народы і рэлігіі. Лічым, што гэта нашае багацце, але і наш доўг перад усімі “тутэйшымі”. Таксама перамены апошніх дзесяцігоддзяў – гэта супольны досвед цэлай Усходняй Еўропы. Таму хочам, каб БАСовішча было фестывалем усіх усходніх еўрапейцаў.

Тое, што можам прымаць у нас беларусаў з Беларусі, важнае для нас як дэкларацыя супольных вартасцяў. Самавызначэнне, грамадзянскія свабоды, пачуццё сувязі з еўрапейскай культурай. Беларусь – частка Еўропы і заўсёды будзем гаварыць пра яе з гонарам.

Гэты фестываль не падзяляе ўдзельнікаў на лепшых і горшых. Гэта фестываль разнародных. Хаця дэмакратычныя працэсы ў кожнай краіне праходзяць па-свойму, то людская і грамадзянская ўражлівасць павінна быць важнай крыніцай узаемнай інспірацыі ды пошукаў.

Музыка нараджае шчырасць ды натуральнасць. Калі дадаць да гэтага адкрытасць жыхароў Падляшша, становіцца ясна, што БАСовішча – гэта месца сапраўднага спаткання з людзьмі. Супольна перажываючы спантанныя эмоцыі, неабходныя на канцэртах, можам лепш зразумець адзін аднаго і ўзаемна падтрымліваць нашыя аспірацыі. Каля мяжы Польшчы і Беларусі няма межаў між намі. […] Фестываль – гэта шматкультурны музычны дыялог. Запрашаем найцікавейшыя польскія, беларускія ды ўкраінскія гурты, але таксама дэбютантаў і музычных маргіналаў. Ад клезмерскага аркестра,[…] цяжкага рока па клубную музыку.

www.racyja.com

**Заданне 2.1. (0–3)**

Напішы план да тэксту ў трох пунктах.

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

**Заданне 2.2. (0–2)**

Напішы, як разумееш словы з другога абзаца. Які гэта стыль беларускай мовы?

Дзерці глотку – .......................................................................................................................

Стыль – .....................................................................................................................................

**Заданне 2.3. (0–2)**

Якая мэта арганізавання „БАСовішча", сярод тых, якія прыводзіць Аўтар тэксту, з'яўляецца, на тваю думку, самай важнай? Абгрунтуй свой адказ.

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

**Заданне 2.4. (0–1)**

На аснове тэксту 2 адкажы праўда гэта ці фальш. Інфармацыі праўдзівыя пазнач літарай (**П**), фальшывыя (**Ф**).

| | праўда | фальш |
|---|---|---|
| 1. БАСовішча пачалі арганізоўваць у XXI стагоддзі. | | |
| 2. На БАСовішчы выступаюць толькі беларускія гурты з Польшчы. | | |

## Заданне 3.

**Wybierz jeden temat i napisz wypracowanie.**

**Тэма 1. Ці мова з’яўляецца скарбам нацыі? Абмяркуй праблему і абгрунтуй свой погляд, спасылаючыся на ніжэй пададзены фрагмент тэксту Францішка Багушэвіча *Прадмова да Дудкі беларускай* і цэлага твора. Твая праца павінна налічваць не менш чым 250 слоў.**

Мацей Бурачок (Францішак Багушэвіч)

***Прадмова да Дудкі беларускай***

Братцы мілыя, дзеці Зямлі-маткі маей! Вам афяруючы працу сваю, мушу з вамі пагаварыць трохі аб нашай долі-нядолі, аб нашай бацькавай спрадвечнай мове, каторую мы самі, да і не адны мы, а ўсе людзі цёмныя «мужыцкай» завуць, а завецца яна «беларускай». Я сам калісь думаў, што мова наша – «мужыцкая» мова, і толькі таго! Але, паздароў Божа добрых людцоў, як навучылі мяне чытаць-пісаць, з той пары я шмат гдзе быў, шмат чаго відзеў і чытаў: і праканаўся, што мова нашая ёсць такая ж людская і панская, як і французская, альбо нямецкая, альбо і іншая якая. Чытаў я ці мала старых папераў, па дзвесце, па трыста гадоў таму пісаных у нашай зямлі і пісаных вялікімі панамі а нашай мовай чысцюсенькай, як бы вот цяпер пісалася. Увідзеўшы гэта, я часта думаў: Божа ж мой, Божа! Што ж мы за такія бяздольныя? Якаясь маленькая Булгарыя – са жменя таго народу, – якіясьці Харваты, Чэхі, Маларосы і другія пабратымцы нашыя […] маюць па-свайму пісаныя і друкованыя ксёнжачкі і газэты, і набожныя, і смешныя, і слёзныя, і гісторыйкі, і баячкі; і дзеткі іх чытаюць так, як і гавораць, а ў нас як бы захацеў цыдулку ці да бацькі лісток напісаць па-свойму, дык, можа б, і ў сваёй вёсцы людзі сказалі, што «піша па-мужыцку», і як дурня абсмяялі б! А можа, і праўды наша мова такая, што ёю нічога добрага ні сказаць, ні напісаць не можна? Ой, не! Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная, як і другім добрым людцам, і гаворым жа мы ёю шмат і добрага, але так ужо мы самі пусцілі яе на здзек, не раўнуючы, як і паны вялікія ахотней гавораць па-французску, як па-свойму. Нас жа не жменька, а з шэсць мільёнаў – больш і шмат больш, не раўнуючы, як жыдоў, напрыклад, або татар, ці армян, а пакажы ж, ваша, хоць адну ксёнжачку ці аб гаспадарцы, ці так аб жыцці нашым, каб па-нашаму?

Ці ж ужо нам канечне толькі на чужой мове чытаць і пісаць можна? Яно добра, а навет і трэба знаць суседзкую мову, але наперш трэба знаць сваю. Перадумаўшы ўсё гэта, я, братцы, адважыўся напісаць для вас сякія-такія вершыкі: хто іх спадабае, таму дзякуй! А хто падумае лепш і больш напісаць, таму чэсць вечная і ад жывых людзей, і ад бацькавых касцей! А пісаць ёсць шмат чаго!

Спрадвеку, як наша зямелька з Літвой злучылася, як і з Польшчай з’ядналася дабравольна, дык усе яе «Бяларусяй» звалі, і недарма ж гэта! Не вялікая, не малая, не чырвоная, не чорная яна была, а белая, чыстая; нікога не біла, не падбівала, толькі баранілася.

Шмат было такіх народаў, што страцілі наперш мову сваю, так як той чалавек прад скананнем, катораму мову займе, а потым і зусім замёрлі. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі! Пазнаюць людзей ці па гаворцы, ці па адзежы, хто якую носе; ото ж гаворка, язык і ёсць адзежа душы.

Ужо больш як пяцьсот гадоў таму, да панавання князя Вітэнэса на Літве, Беларусія разам з Літвой баранілася ад крыжацкіх напасці, і шмат местаў, як Полацк, прызнавалі

над сабой панаванне князёў Літоўскіх, а после Вітэнэса Літоўскі князь Гядымін злучыў зусім Беларусію з Літвой у адно сільнае каралеўства і адваяваў шмат зямлі ад крыжакоў і ад другіх суседаў. Літва пяцьсот дваццаць гадоў таму назад ужо была ад Балтыцкага мора ўдоўжкі аж да Чорнага, ад Дняпра і Днястра-ракі да Нёмна; ад Каменьца места аж да Вязьмы – у сярэдзіне Вялікаросіі; ад Дынабурга і за Крамяньчук, а ў сярэдзіне Літвы, як тое зярно ў гарэху, была наша зямліца − Беларусь! Можа, хто спытае: гдзе ж цяпер Беларусь? Там, братцы, яна, гдзе наша мова жывець: яна ад Вільні да Мазыра, ад Вітэбска за малым не да Чарнігава, гдзе Гродна, Міньск, Магілёў, Вільня і шмат мястэчкаў і вёсак...

Ф.Багушэвіч, *Прадмова да зборніка „Дудка беларуская”* [у:] В. Сянкевіч, Я. Грыгарук, *Беларуская літаратура. Хрэстаматыя для сярэдніх школ*, Warszawa 2001, s. 74–75.

**Тэма 2. Зрабі аналіз верша. Пастаў інтэрпрэтацыйны тэзіс і абгрунтуй яго. Твая праца павінна налічваць не менш чым 250 слоў.**

Максім Танк

***Паэзія***

Я ведаў, што ты – бліскавіца,
Што хмары рассекла;
Я ведаў, што ты – вызваленне
З няволі і пекла.

Вясновая кветка,
Што камень прабіла магільны,
Разведчыка след
На дарозе крамністай і пыльнай;

Я ведаў, што ты – пацалунак,
Ты – дружба і радасць,
Ты – чорствага хлеба скарынка
І сок вінаграда.

А ты аказалася большым:
Ты – кроў, што пульсуе па жылах,
Ты – сонца, якое
Прасторы святлом азарыла,

І без чаго, як без маці
Або без радзімы,
Ні нараджацца, ні жыць
На зямлі немагчыма!

М. Танк, *Паэзія* [у:] Я. Карчэўскі, *Сучасная беларуская літаратура. Падручнік па літаратурнай і культурнай адукацыі для вучняў 3 класа сярэдніх школ*, Warszawa 2003, s. 56.

# WYPRACOWANIE

**na temat nr....................**

**Tabelę wypełnia egzaminator!**

| | | Liczba punktów | Suma | Uzasadnienie przyznania 0 punktów |
|---|---|---|---|---|
| rozprawka | A. | 0 – 3 – 6 | | |
| | B. | 0 – 4 – 6 – 9 – 12 | | |
| interpretacja | A. | 0 – 2 – 4 – 6 | | |
| | B. | 0 – 4 – 8 – 12 | | |
| | C. | 0 – 1 – 2 | | |
| | D. | 0 – 2 – 4 | | |
| | E. | 0 – 1 – 2 | | |
| | F. | 0 – 1 – 3 | | |
| | G. | 0 – 2 – 4 | | |
| | H. | 0 – 2 – 4 | | |

## BRUDNOPIS *(nie podlega ocenie)*

MOB-P1_1P-152

**PESEL**

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | |

Miejsce na naklejkę
z nr. PESEL

## WYPEŁNIA ZDAJĄCY

## WYPEŁNIA EGZAMINATOR

Temat: ☐1 ☐2

| Nr zad | Punkty | | | |
|---|---|---|---|---|
| | 0 | 1 | 2 | 3 |
| 1.1 | ☐ | ☐ | | |
| 1.2 | ☐ | ☐ | | |
| 1.3 | ☐ | ☐ | | |
| 1.4 | ☐ | ☐ | | |
| 1.5 | ☐ | ☐ | | |
| 2.1 | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ |
| 2.2 | ☐ | ☐ | ☐ | |
| 2.3 | ☐ | ☐ | ☐ | |
| 2.4 | ☐ | ☐ | | |

| | Punkty | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| A i B | 0 | 2 | 3 | 4 | 6 | 7 |
| | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ |
| | | 8 | 9 | 10 | 12 | 14 |
| | | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ |
| | | 15 | 16 | 18 | | |
| | | ☐ | ☐ | ☐ | | |
| C | 0 | 1 | 2 | | | |
| | ☐ | ☐ | ☐ | | | |
| D | 0 | 2 | 4 | | | |
| | ☐ | ☐ | ☐ | | | |
| E | 0 | 1 | 2 | | | |
| | ☐ | ☐ | ☐ | | | |
| F | 0 | 1 | 3 | | | |
| | ☐ | ☐ | ☐ | | | |
| G | 0 | 2 | 4 | | | |
| | ☐ | ☐ | ☐ | | | |
| H | 0 | 2 | 4 | | | |
| | ☐ | ☐ | ☐ | | | |

☐N SUMA PUNKTÓW

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| D | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ |
| | 0 | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| J | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ |
| | 0 | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |

**KOD EGZAMINATORA**

.................................................
Czytelny podpis egzaminatora

KOD ZDAJĄCEGO